7. Эткинд, Е.Г. Флейтист и крысы: Поэма Марины Цветаевой «Крысолов» в контексте немецкой народной легенды и ее литературных обработок / Е.Г. Эткинд // Кафедральная библиотека: кафедра новейшей русской литературы [Электронный ресурс]. – 2008. – Режим доступа : http://novruslit.ru/library/?p=44. – Дата доступа : 2.08.2013.

*Святлана Андрыеўская*

## ДЗІЦЯЧЫ ФАЛЬКЛОР ЯК ЭЛЕМЕНТ ДЗІЦЯЧАЙ СУБКУЛЬТУРЫ

*У дадзеным дакладзе разглядаюцца некаторыя тэарэтычныя і практычныя аспекты вывучэння дзіцячага фальклору. Аналізуюцца тэндэнцыі развіцця дзіцячага фальклоруа ў сучаснасці. Разглядаюцца асаблівасці дзіцячай субкультуры, як асяроддзя, у якім фарміруюцца асноўныя жанры дзіцячага фальклору.*

Дзіцячы фальклор існуе як неад'емная частака дзіцячай субкультуры. Згодна з даследаваннямі сацыяльных псіхолагаў, сям'я і дарослыя вызначаюць «зону бліжняга развіцця дзіцяці» (Л.Выгоцкі), а дзіцячая супольнасць, дзіцячая субкультура, рэферэнтная дзіцячая група − зону варыятыўнага развіцця [9, с. 107]. Гэтая зона развіцця дзіцяці вызначаецца групай дзяцей у працэсе гульнёвага ўзаемадзеяння і камунікацыі, пры гэтым знакавымі з'яўляюцца не толькі словы, але і дзеянні, жэсты, рухі. Менавіта ў межах дзіцячай субкультуры, праз зону варыятыўнага развіцця дзіця з дапамогай фальклорных формаў, міфалогіі, традыцыйнай гульні ўключаецца ў культурнае поле грамадства.

Дзіцячая субкультура – у шырокім значэнні: тое, што створана грамадствам для дзяцей і дзецьмі; у вузкім значэнні: сэнсавая прастора каштоўнасцей, спосабаў дзейнасці, форм камунікацыі, што ажыццяўляюцца ў дзіцячых супольнасцях у той ці іншай канкрэтна-гістарычнай сітуацыі развіцця [9, с. 104]. Неад'емны элемент дзіцячай субкультуры – дзіцячы фальклор. У сучаснасці дзіцячы фальклор стаў прадметам для вывучэння не толькі фалькларыстаў, але і псіхолагаў.

Прадметам даследавання ў дакладзе з'яўляюцца развіццё і змены дзіцячага фальклору як элемента дзіцячай субкультуры на прыкладзе апублікаваных і сабраных уласна аўтарам тэкстаў.

У прасторы дзіцячай субкультуры (гульнях, дзіцячым фальклоры) утрымліваюцца пласты рознай даўнасці, звяртаючыся да якіх, дзіця ўваходзіць у зону варыятыўнага развіцця ў рэжыме «дыялогу культур», іншых логік, маральных уяўленняў, моваў. Асабліва гэта характэрна для дзіцячага фальклору, які сам з'яўляецца зонай варыятыўнасці. Даследчыкі адзначаюць дынамічнасць традыцыйных вусных тэкстаў, калі адно і тое ж дзіця можа прадставіць адразу некалькі варыянтаў тэксту [1, с. 124].

Некалькі слоў аб вывучэнні і зборы дзіцячага фальклору на тэрыторыі Беларусі. Упершыню грунтоўнае беларускае навуковае выданне «Дзіцячы фальклор» выйшла ў свет ў 1971 годзе (складальнік Г.А.Барташэвіч). У ім прадстаўлены ці ўлічаны ў каментарыях усе вядомыя на той час архіўныя запісы і публікацыі гэтага жанру [2]. У 2000 годзе выдадзены цікавы акадэмічны зборнік «Гульні, забавы, ігрышчы» [3], у якім сабраны тэксты з усёй Беларусі. У 2006 годзе ў серыі «Фальклор Беларусі XX – XXI стст.» выдадзены зборнік «Дзіцячы фальклор», складзены на падставе Фальклорнага архіва Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка, які пачаў фарміравацца з 1992 года. Аўтары зборніка разглядаюць сваё выданне як дапаўненне да акадэмічнага тома [5]. Шмат тэкстаў «утрымлівае зборнік «Дзіцячы фальклор Віцебшчыны ў сучасных запісах» выдадзены УА «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М.Машэрава» [4]. Малым жанрам дзіцячага фальклору прысвечаны зборнік складзены Т.В.Валодзінай, А.І.Гурскім, Г.А.Барташэвіч, К.П.Кабашнікавым − «Малыя жанры. Дзіцячы фальклор» [7]. Цікавы погляд на дзіцячы фальклор прадстаўлена Р.М.Кавалёвай і Т.В.Лук'янавай. Аўтары манаграфіі «Жанравы код фальклорнай карціны свету» [6] падзяляюць тэксты дзіцячага фальклору на тры групы:

1. мацярынскі фальклор, які прызначаны для выхавання маленькіх дзяцей. Яго называюць «мацярынскай школай», «паэзіяй пеставання». Ён складаецца з калыханак і забаўлянак.

2. Фальклор дарослых для дзяцей: а) разлічаныя на дзіцячае асяроддзе песні, казкі, загадкі і інш.; б) створаныя для дзіцячых абрадаў календарнага цыкла песні, якія вар'іруюцца падчас выканання ў межах калядных, васільеўскіх, куставых і іншых віншавальных абходаў хат дзецьмі асобна ад дарослых.

3. Стыхійна перанятыя ад старэйшых жанры, якія цалкам, або часткова, страцілі для тых актуальнасць: а) былыя магічныя заклічкі − звароты да прыродных з'яў, звяроў, птушак, насякомых і інш.; б) жартоўныя канты (гарадскія бытавыя песні) алегарычнага складу пра птушак, звяроў, хатніх жывёл, насякомых і інш.

4. Часткова запазычаныя ад дарослых жанры, мадэлі якіх выкарыстоўваліся надалей для стварэння новых твораў: б) прымхліцы − «страхі», «страшылкі», якія на думку вучоных ствараюць вобласць сучаснай дзіцячай міфалогіі; в) «садысцкія вершыкі» літаратурнага паходжання, мадэль якіх выкарыстоўваецца для стварэння падобных тэкстаў; в) т.зв. дзіцячыя анекдоты (напрыклад, пра Вовачку, настаўніка, вучняў, бацькоў і пад.)

5. Уласна дзіцячы фальклор. Ён трывала знаходзіцца ў гульнёвай сферы і здаўна пераймаецца па гарызанталі ад равеснікаў: а) творы, звязаныя з рухомымі гульнямі (жараб'ёўкі, лічылкі, прыгаворкі, прыпеўкі); б) творы, звязаныя са слоўнымі гульнямі (скорагаворкі, маўчанкі, дыялогі-хітрыкі, ланцужковыя слоўныя дыялогі (тыпу геаграфічных), адгаворкі) і інш. [6, с. 38].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, у манаграфіі Р.М.Кавалёвай і Т.В.Лук’янавай [6] дзіцячы фальклор прапануецца класіфікаваць згодна з разнастайнымі прынцыпамі: умоўна-генетычным: фальклор дарослых для дзяцей, уласна дзіцячы, функцыянальным: гульнявы і пазагульнявы, фармальным: песенны, вершаваны, празаічны, драматычны.

На погляд аўтара артыкула, абраны прынцып класіфікацыі прымальны, але мае шэраг недахопаў. У прыватнасці, не ўлічваецца той факт, што ва ўмовах сучаснай урбанізацыі (а гарадское асяроддзе ў Беларусі пераважна рускамоўнае) і панавання школьнай сістэмы (у межах якой дзеці праводзяць большую частку дня), беларускамоўныя тэксты ў сучасным дзіцячым фальклоры амаль адсутнічаюць. Пры гэтым, нельга адмаўляць той факт, што дзеці працягваюць ствараць і карыстацца тэкстамі, якія па сваёй прыналежнасці адназначна адносяцца да дзіцячай субкультуры. У дадзеным выпадку, больш прымальны погляд расійскай даследчыцы М.Асорынай [8], якая вылучае асобныя групы сучаснага дзічага фальклору, якія генетычна звязаны з «традыцыйнымі формамі», аднак, моцна ад іх адрозніваюцца. Напрыклад, «страшылкі» не характэрныя для традыцыйнага фальклора дзяцей. Да таго ж на змест некаторых фальклорных формаў аказваюць моцны ўплыў сацыяльныя рэаліі, прывядзем прыклад. Дзіцячая лічылка (школьны дзіцячы фальклор) − тэкст падаецца без перакладу: «Жили были баба с дедом, / ели кашу с молоком. / Дед на бабу рассердился – / и по пузу кулаком! / А из пуза два арбуза / покатились по союзу / ку-выр-ком!». Мы бачым тут адлюстраванне гістарычных і сацыяльных рэалій. Вольны час сучасныя дзеці бавяць не толькі за камп’ютэрам і ў школе, а як і ў даўнейшыя часы ў жывой гульні. Напрыклад, апісанне гульні «Штандар-штандар». «Зачын» для гульні ў мяч (школьны дзіцячы фальклор): «Штандэр -штандэр, лови, / Раз, два, три...». Апісанне дзеяння: Дзеці становяцца ў круг, «вóда» падкідвае мяч у гару, пасля чаго дзеці разбягаюцца ў розныя бакі. Задача гульцоў – адбегчы як мага далей. Як толькі мяч падае на зямлю, дзеці спыняюцца («заміраюць»), а «вóда» бярэ мяч і адлічвае ад месца яго падзення умоўленую раней колькасць крокаў (напрыклад, дзесяць) у бок таго гульца, якога хоча «выбіць». І кідае мяч ў выбранага гульца. Калі трапляе, то той становіцца новым «вóдам», калі ж не, то гульня паўтараецца са старым «вóдам». Колькасць удзельнікаў гульні: ад трох і болей. Гульня выхоўвае: спрыт, лоўкасць, меткасць, уменне правільна ацаніць адлегласць да прадмета. Бачна, што ў прыведеных прыкладах ёсць сувязь як з традыцыйнымі формамі фальклору, так і з новымі сацыяльнымі абставінамі.

Такім чынам, традыцыйны беларускі дзіцячы фальклор фарміраваўся ў сялянскім асяроддзі, дзе дзіця знаходзілася большую частку часу ў сям’і, сучасны ж дзіцячы фальклор бытуе ў сітуацыі маладзетнай сям’і і школьнай сістэмы, калі дзіця кантактуе з дарослымі ў адных абставінах, а з дзецьмі − у іншых. Акрамя таго, для традыцыйнага грамадства не характэрна абасобленасці сферы дзяцінства, для традыцыйнай мадэлі сям’і не быў характэрны дзетацэнтрызм, як для сучаснай сям’і. Калі, у час фарміравання традыцыйных формаў дзіцячага фальклору, дзіця не адасаблялася ад сям’і, сферы дарослых, то ў сучаснасці пануе погляд на дзяцінства, як на «падрыхтоўку» да дарослага жыцця. Гэтыя асаблівасці наклалі свой адбітак на формы і жанры дзіцячага фальклору.

**Спіс літаратуры:**


1. Абраменкова, В.В. Социальная психология детства: развитие отношений ребёнка в детской субкультуре / В.В. Абраменкова. – М. : МПСИ Воронеж : МОДЭК, 2000. – 413 с.
2. Барташэвіч, Г.А. Вершаваныя жанры беларускага дзіцячага фальклору / Г.А. Барташэвіч ; рэд. К.П. Кабашнікаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1976. – 168 с.
3. Гульні, забавы, ігрышчы / НАН Беларусі, ІМЭФ ; уступ. арт., уклад., сіст. матэр. і камент. А.Ю. Лозкі ; рэдкал.: А.С. Фядосік (гал. рэд.) [і інш.] – 3-е выд. – Мінск : Беларус. навука, 2000. – 530 с.
4. Дзіцячы фальклор Віцебшчыны ў сучасных запісах / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, УА «Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава» – Віцебск : Выдавецтва ВДУ, 2007. – 200 с.
5. Дзіцячы фальклор / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўнверсітэт імя М. Танка». – Мінск : БДПУ, 2006. – 359 с.
6. Кавалёва, Р.М. Жанравы код фальклорнай карціны свету : няказкавая проза, дзіцячы фальклор, загадкі, казкі / Кавалёва Р.М., Лук’янава Т.В. – Мінск : Белпрінт, 2012. – 122 с.
7. Малыя жанры. Дзіцячы фальклор / [Т.В. Валодзіна, А.І. Гурскі, Г.А. Барташэвіч, К.П. Кабашнікаў]. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – 439 с.
8. Осорина, М.В. Секретный мир детей в пространстве мира взрослых / М.В. Осорина. – СПб. : Питер, 2008. – 304 с.
9. Финькевич, Л.В. Социальная психология детства / Л.В. Финькевич, Н.В. Савченко. – Мінск : БГПУ, 2010. – 146 с.


*Аляксей Камінскі*

## НАРОДНЫЯ ТРАДЫЦЫІ ТВОРЧАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ВЕСНАВЫХ АБРАДАЎ НА ВОЛЬНЫМ ПАВЕТРЫ

Са старадаўніх часоў захавалася павер’е: чым раней прыляцяць з выраю птушкі – вястунні Вясны, тым хутчэй пачнецца сяўба, выган скаціны ў поле. Таму на поўдні, дзе прырода пачынае ажываць ад зімовага сну значна раней, вясну клікалі ў апошні дзень Масленіцы, а ў заходніх і паўночна-заходніх мясцовасцях – на Аўдакію,

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ